НАВІНКІ КНІГАВЫДАННЯ




# *АЛФАВІТНАЕ ПАДАРОЖЖА ПРАЦЯГВАЕЦЦА*

**Пабачыла свет новая кніга для сямейнага чытання. Яе аўтар член СПБ, паэтэса, публіцыст Тамара МАЗУР (Гродзенскі раён). Новая работа пісьменніцы атрымала назву «Скідзель. Алфавітныя прыпынкі ў горадзе-спадарожніку Гродна»** ***(Мінск, «Ковчег», 2025).***

Нагадаем, што [папярэдняе выданне] «Алфавітныя прыпынкі дзяўчынкі Літарынкі» *(Мінск, «Ковчег», 2024)* прынесла пісьменніцы перамогу ў намінацыі «Дзіцячая літаратура» Абласнога літаратурнага конкурсу імя Максіма Багдановіча. Новая кніга – у пэўным сэнсе канцэптуальны працяг папярэдняга этапу творчасці пісьменніцы (частка дылогіі).

Новая кніга змяшчае вершы, нарысы, даведкі; гэта аўтарскі адукацыйны праект беларускай творцы са Скідзеля, унікальны паэтычны праваднік для ўсёй сям'і. Кожны прыпынак на старонках кнігі – літара, з якой пачынаецца назва скідзельскай славутасці. 55 вершаў паэтэсы, а таксама 100 аўтарскіх фота Тамары Мазур і яе дачкі Аксаны – гэта натхненне, адкрыццё, эмацыйнасць. Аўтар кнігі разнастаіла выданне краязнаўчымі даследаваннямі і даведкамі, у тым ліку падрыхтаванымі скідзельскімі краязнаўцамі, кіраўнікамі музеяў і настаўнікамі М. А. Вабішчэвіч, А. А. Кавальчук, Т. А. Савянковай, А. М. Салей. Кніга «Скідзель. Алфавітныя прыпынкі ў горадзе-спадарожніку Гродна» адрасавана шырокаму колу чытачоў.



**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**Гродзенскае абласное аддзяленне**

**На фота:** першая старонка вокладкі новай кнігі і адна з фотаілюстрацый.

## **Слова выдаўца**

Шаноўныя чытачы!

Кожны горад, аграгарадок, вёсачка ці хутарок – не проста кропка на карце, а чыйсці лёс і малая радзіма. Таму ў краязнаўчых выданняў заўсёды ёсць свой чытач. Зараз да іх далучыліся і вы, пачаўшы чытаць кнігу «Скідзель. Алфавітныя прыпынкі ў горадзе-спадарожніку Гродна».

Аўтар і ўкладальнік гэтага літаратурна-мастацкага выдання – паэт, журналіст член Саюза пісьменнікаў Беларусі Тамара Мазур. У 2024 годзе ў нашым выдавецтве «Каўчэг» выйшлі ў свет некалькі яе кніг. Адна з іх – «Алфавітныя прыпынкі дзяўчынкі Літарынкі» з'яўляецца пераможцай абласнога конкурсу імя Максіма Багдановіча ў намінацыі «Дзіцячая літаратура». Сярод шэрагу «дарослых» выданняў паэзіі і публіцыстыкі пісьменніцы, менавіта кніга для юных чытачоў займела самы вялікі поспех. Таму Тамара Мазур вырашыла прадоўжыць аўтарскую адукацыйную серыю «Алфавітныя прыпынкі».

Цепер алфавітны маршрут пракладзены пісьменніцай найперш для падлеткаў – па Скідзелі, які мае статус горада-спадарожніка Гродна, адметны развітай прамысловасцю, багатай культурнай і духоўнай спадчынай.

Старонкі ў кнізе «Скідзель. Алфавітныя прыпынкі ў горадзе-спадарожніку Гродна» пазначаныя літарамі алфавіта, з якіх пачынаюцца назвы славутасцей і адметнасцей горада альбо прыгарада. Пра іх Тамара Мазур напісала 55 вершаў, што цалкам успрымаецца як паэтычная энцыклапедыя сучаснага Скідзеля, каштоўнасць якой будзе ўзрастаць з цягам часу.

Шчаслівай вандроўкі і цікавых прыпынкаў!

**Алена КУЗЬМІНА**
**дырэктар ТАА «Каўчэг»**



www.pisateli.by